АНТРОПАЎ М. П. (Мінск, Беларусь)

# Канфесіяналізм як дамінанта этнічнай вылучанасці (стараверы цэнтральнай Міншчыны)

Стараверства на беларускіх землях вывучана надта нераўнамерна. Калі гісторыі, мове, матэрыяльнай і духоўнай культуры старавераў гомельскай Веткі прысвечаны і сталая экспазіцыя мясцовага музея, і салідныя працы рознага кшталту, то іх аднаверцы ў другіх рэгіёнах, асабліва ў цэнтральнай Міншчыне, такую ўвагу не атрымалі. З гэтай прычыны, напрыклад, мясцовы дыялект, даследаваны па запісах з дзвюх-трох вёсак, дасюль кваліфікуецца як «астраўная гаворка», якая мае «матчыны» пскоўскія рысы. А між іншым па дадзеных перапісу 1897 г. толькі ў Барысаўскім п. Мінскай губ. больш за 2 тысячы стараверaў пражывалі ў 57 населеных пунктах. Зразумела, што за мінулае стагоддзе і дэмаграфічны, і этнічны, і ўласна моўны складнікі ў гэтых вёсках зазналі значныя змены, але нават і зараз гаворка ідзе ўсё ж такі пра даволі кампактны стараверскі этнадыялектны арэал.

З сярэдзіны 60-х гадоў мінулага стагоддзя надзвычай хутка пайшоў працэс нівеліроўкі этнамоўных рыс стараверaў пазначанага арэала, які меў два выразныя вектары «размыву», звязаныя з беларускай, але асабліва з рускай моўнымі стыхіямі, што трансліраваліся пераважна праз СМІ-крыніцы. Гэты працэс у значнай ступені садзейнічаў страце вялікай колькасці адметных рыс на ўсіх моўных узроўнях. Разам з імі пераходзіла ў нявыяўлены і/ці латэнтны стан нацыянальная самасвядомасць.

Фактычна толькі канфесійны складнік («я старавер – ён не старавер») з'яўляецца тут апошнім бастыёнам нацыянальнага, г. зн. як бы апрыёры рускага, хоць гэта канстатацыя можа і ня быць у такой ступені адназначнай. Але ў любым выпадку прыналежнасць да стараверскага «древлеправославия» вызначае для мясцовага жыхара (або выхадца з гэтых мясцін) яго этнічную вылучанасць.

У дакладзе прадугледжваецца падрабязна разглядзець розныя сегменты рэалізацыі гэтага самавызначэння на канфесійнай аснове.